№ 129 (481)
Серада, 22 ліпеня 1998 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў
у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 3000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Народная Воля

Шчыра

Вас абавязвае не толькі прызванне вучонага...

Адкрыты ліст прэзідэнту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.П.Вайтовічу

Вельмі шаноўны Аляксандр Паўлавіч!

Прачытаў у газеце фотакопію падпісанага Вамі дакумента — і вымушаны звярнуцца да Вас з гэтым лістом. Мне невядома, дзе і як зарадзілася думка адмяніць у Акадэміі навук залік па беларускай мове для аспірантаў і спаборнікаў, але не сумняваюся, што там у тую хвіліну ні палітычна-дзяржаўнай, ні навуковай, ні проста чалавечай мудрасці, прабачце, не было. Ды, зрэшты, Бог з ёй, з палітыкай. Палітыка — заўсёды справа часовая, яна перагледжваецца і мяняецца людзьмі, таксама на гэтым свеце часовымі. А мова народа — катэгорыя даўгавечная, наколькі даўгавечны сам народ. Яна не з нас пачалася і не на нас кончыцца. Не разумець гэтага людзі вучоныя не могуць. Як не могуць не разумець і таго, якая магутная стваральная сіла закладзена ў самім феномене нацыянальнай мовы.

Якімі ж меркаваннямі кіраваліся члены Прэзідыума НАН, прымаючы такую абразлівую для беларускай мовы, для памяці вялікіх дзеячаў беларускай навукі і культуры пастанову? Што можна выставіць у яе апраўданне — якія такія архіважныя аргументы, важнейшыя, чым павага да нацыянальнай мовы краіны, у якой жывеш і працуеш? Удумайцеся толькі: у беларускую навуку будуць прыходзіць маладыя людзі без ведання дзяржаўнай мовы сваёй дзяржавы, без магчымасці карыстацца навуковымі і культурнымі багаццямі, увасобленымі ў беларускім слове.

Паважаны Аляксандр Паўлавіч! Не знаю, ці будзе для Вас гэта нешта значыць, але ведайце, што пастанова Прэзідыума НАН успрынята патрыятычнай беларускай інтэлігенцыяй з горкім засмучэннем і расчараваннем. У любой краіне свету нацыянальная акадэмія навук з'яўляецца для ўсіх іншых грамадзян прыкладам таго, як трэба шанаваць і любіць мову свайго народа, да таго ж — яна лічыць сваім абавязкам даваць усім простым смертным філасофскае вытлумачэнне важнасці моўнага фактару ў жыцці грамадства. Што ж у святле гэтага азначае прынятая 28 траўня 1998 года пастанова Прэзідыума НАН Беларусі? Прымаць такую пастанову — значыць ісці шляхам перараджэння беларускай нацыянальнай Акадэміі ў антыбеларускую, антынацыянальную. І чым жа, дазвольце спытаць, вабіць членаў Прэзідыума такая перспектыва, чым радуе? Хочацца з такім грамадзянскім подзвігам увайсці ў гісторыю Беларусі?

Я прашу Вас, паважаны Аляксандр Паўлавіч, абмеркаваць яшчэ раз гэта пытанне на пасяджэнні Прэзідыума НАН — з тым каб адмяніць паспешна прынятую пастанову аб неабавязковасці заліка па беларускай мове для аспірантаў і спаборнікаў. Зрабіць гэта Вас абавязвае не толькі прызванне вучонага і сан грамадзяніна, але і сыноўская памяць аб тым, дзе Вы нарадзіліся, сярод якіх людзей выраслі, якою мовай, якім словам з самага дзяцінства бласлаўлялі Вас на добрыя, разумныя, чалавечыя справы. Лягчэй за ўсё спаслацца сёння на тую ці іншую пастанову Савета міністраў і сказаць: мы абавязаны яе выконваць. Акадэмія навук валодае немалымі правамі аўтаномнасці, самастойнасці ў забеспячэнні свайго ўнутранага распарадку. Яна можа прыняць сваё рашэнне аб неабходнасці ведання беларускай мовы — дзяржаўнай мовы краіны! — усімі тымі навукоўцамі, якія хочуць стаць яе супрацоўнікамі ці атрымаць яе блаславенне на навуковую дзейнасць у Беларусі. Зрэшты, хто ж, калі не вучоныя, абавязаны растлумачыць і даказаць Савету міністраў, якую памылку ён робіць, замахваючыся на самы каштоўны духоўны скарб народа — на яго мову. Дзяржаўныя чыноўнікі могуць і не разумець страшнай грахоўнасці свайго ўчынку ("Ойча! Даруй ім, бо не ведаюць, што робяць"), але прызнаныя вучоныя, але акадэмікі, але прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты краіны не могуць гэтага не разумець, не могуць гэтага не ведаць.

У спадзяванні на справядлівы, разумны, мудры крок кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі —

З павагай
Ніл ГІЛЕВІЧ.

Стоп-кадр

Мацярынства.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Палітычныя партыі пачалі падрыхтоўку да выбараў у мясцовыя саветы

Беларускія палітычныя партыі пачалі падрыхтоўку да выбараў у мясцовыя Саветы, якія пройдуць у 1999 годзе.

Як стала вядома БелаПАН, у Віцебску прайшлі перамовы аб стварэнні перадвыбарнага блока паміж Віцебскай абласной арганізацыяй Камуністычнай партыі Беларусі і рэгіянальнай арганізацыяй Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Падобныя перамовы вядуцца цяпер паміж мінскімі гарадскімі арганізацыямі гэтых партый. Па словах кіраўніка спраў ЦК КПБ Леаніда Школьнікава, гэтая ініцыятыва зыходзіць ад рэгіянальных партыйных арганізацый, па лініі ж ЦК КПБ ніякага пагаднення паміж камуністамі і ліберал-дэмакратамі не падпісвалася. Не выключана, што бліжэйшым часам да гэтага блока далучацца і іншыя партыі і арганізацыі.

Юрый ПАЦЁМКІН, БелаПАН.

Надвор'е

22 і 23 ліпеня на тэрыторыі рэспублікі захаваецца пераменная воблачнасць. 22-га ўдзень па паўночным захадзе, 23 уначы — па паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер паўднёва-заходні 3—8 м/с, удзень 22-га пры навальніцы парывы да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы +16...+21, удзень +25...+30. Па паўночным захадзе ўначы +10...+15, удзень — +20...+25.

...И можно ли после этого верить Коноплеву?

Анатолий Малофеев, Владимир Коноплев и еще две дамы, выезжавшие в Копенгаген на сессию Парламентской ассамблеи ОБСЕ, на прошлой неделе провели в Минске пресс-конференцию. Досужие журналисты к этому времени уже располагали персональным списком тех официальных лиц Беларуси, кому отныне будет запрещен въезд в страны Евросоюза и США. Естественно, они поинтересовались: почему в "черном списке" нет руководителей так называемого Национального собрания Республики Беларусь?

Ответить на вопрос вызвался Владимир Коноплев. По его словам, он, Павел Шипук, Анатолий Малофеев и другие руководители структур Национального собрания и не могли войти в этот список. Если бы такое случилось, резюмировал г-н Коноплев, то получилось бы, что Европа признала Национальное собрание.

Но Европа, как не признавала, так и не признает "карманный" парламент. И не только Европа. Руководители делегаций подавляющего большинства стран СНГ не поддержали притязания Национального собрания. Даже Кыргызстан, который входит в так называемую четверку, и тот оказался среди противников официальных властей Беларуси, которые пытаются выдать черное за белое, "забыв" про многочисленные нарушения во время проведения так называемого общенародного референдума.

На пресс-конференции участники поездки в Копенгаген, естественно, сосредоточили все внимание на, по их мнению, двойных стандартах Запада по отношению к Беларуси. Тот же Коноплев с обидой говорил: в Каире те же западные страны нас приняли, а в Копенгагене отказали. Вот и образец двойного стандарта.

Безусловно, что касается двойных стандартов, Владимир Николаевич Коноплев, как ни странно, прав, но только при одном условии — если все это примерять на себя. Ведь в Каире Беларуси возобновили членство в международной организации, которую парламентарии всех стран мира не называют иначе, как клуб. Это действительно клубное заведение, которых теперь на земном шаре масса. Единственное условие, чтобы стать его членом, — уплатить соответствующий взнос. А Парламентская ассамблея ОБСЕ — это авторитетный серьезный орган, который принимает очень важные решения. Вот в чем и есть подлинная суть "двойных стандартов". Получается так — в солидную организацию вход открыт только действительным представителям белорусского народа, то есть законно избранному Верховному Совету 13-го созыва, в клуб — каждому, у кого есть деньги.

Кстати, о деньгах. Официальные лица Беларуси каждый раз, когда дело касается поездки оппозиции за рубеж, многозначительно поднимают вверх палец и говорят о том, что оппозиция ездит за западные деньги. А как же официальные власти? Они, понятно, за западные деньги не ездят. Вот и в Копенгаген они отправились за наши народные денежки, взяли их из бюджета. Тысячи долларов ушли на командировку троих представителей Национального собрания. Больше того, в Копенгаген поехали еще три технических сотрудника. На каждого представителя Национального собрания — по одному техсотруднику (Анатолий Малофеев, как бы не в счет, поскольку он отправлялся в составе делегации Парламентской ассамблеи стран СНГ). Такую сладкую жизнь не могут позволить себе даже парламентарии богатейших европейских стран. А далее, коль, казалось бы, дали от ворот поворот, не признав полномочия "карманного" парламента, нормальным людям в самый раз тут же сложить баулы и отправиться восвояси. Но наши не такие! Они пробыли в столице Дании до самого последнего момента. И за все эти дни исправно получали командировочные, деньги на гостиницу, питание... Чем не райская жизнь? И можно ли после таких историй верить Коноплеву и сотоварищи, что они пекутся о белорусском народе?

Владимир ГЛОД.

Пры правядзенні чарговага вобыску ў доме былога міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіля Лявонава забралі паляўнічую стрэльбу

На мінулым тыдні ў доме былога міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Васіля Лявонава быў праведзены паўторны вобыск.

Як паведаміла БелаПАН жонка экс-міністра Антаніна Лявонава, калі яна прыйшла ў рэспубліканскую пракуратуру, каб атрымаць дазвол на спатканне з мужам, следчы Іван Бранчэль заявіў, што мае намер разам з ёй паехаць у размешчаны пад Мінскам дом Лявонавых для правядзення экспертызы. Антаніна Лявонава адмовілася ехаць са следчым, заявіўшы, што экспертыза праводзіцца пасля суда і адчужэння дома.

Пасля такой заявы яе пратрымалі ў кабінеце следчага больш за чатыры гадзіны, не дазволіўшы звязацца з адвакатам. Жанчыну не пусцілі ў паліклініку, куды яна павінна была ісці ў гэты дзень. Па словах А.Лявонавай, фактычна гэта было незаконнае затрыманне. За час, пакуль яна знаходзілася ў пракуратуры, была вынесена пастанова аб правядзенні вобыску. У выніку А.Лявонава ў суправаджэнні следчых і экспертаў вымушана была паехаць у Прылукскую Слабаду (Мінскі раён). Супрацоўнікі пракуратуры правялі вобыск у доме, у двары і надворных пабудовах. Падчас вобыску была канфіскавана паляўнічая стрэльба — падарунак жонкі і дзяцей да 50-годдзя Васіля Севасцьянавіча, а таксама патроны.

Варта адзначыць, што на захоўванне стрэльбы меліся ўсе неабходныя дакументы, якія таксама былі канфіскаваны, хаця падчас першага вобыску іх не чапалі. Супрацоўнікі пракуратуры правялі замеры дома і ўсіх пабудоў. У пратаколе аб правядзенні вобыску Антаніна Лявонава напісала, што лічыць гэтыя дзеянні пракуратуры незаконнымі. Пасля інцыдэнту з вобыскам стан здароўя жанчыны, якая нядаўна перанесла інсульт, значна пагоршыўся.

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

Незалежная экспертыза

Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар

Чаму з мільёнам "зайчыкаў" нельга заходзіць у магазін...

У статыстычных звестках, якія штомесячна друкуюцца на старонках дзяржаўных газет, абавязкова падкрэсліваецца "небывалы" рост вытворчасці. Але разам з тым статыстыка ўсё ж мусіць абвяшчаць і многія лічбы, якія характарызуюць зніжэнне жыццёвага ўзроўню. Ды і як ты гэта схаваеш, калі людзі ўспрымаюць інфармацыю аб сваім дабрабыце кожны дзень па цэнніках у крамах. Тым болей што мінімальная заработная плата не павышалася ўжо цэлых шэсць месяцаў. Таму статыстыка фактычна не прыводзіць даных аб росце менавіта рэальнай заработнай платы, а толькі паведамляе аб яе празмерна нізкім узроўні ў асобных галінах гаспадаркі. Напрыклад, у сацыяльным забеспячэнні ў маі яна складала толькі 1.856.000 рублёў, ці на 46 працэнтаў была ніжэй, чым у сярэднім па рэспубліцы, у сельскай гаспадарцы — на 43 працэнты ніжэй. Але пра гэта ўпамінаецца не ўпершыню. Паляпшэння, аднак, ніякага няма. Адна канстатацыя.

Да таго ж не скарачаецца, а расце апошнім часам запазычанасць па заработнай плаце. На пачатку лета яна склала велізарную суму — 1128,9 мільярда рублёў. Гэтая трывожная з'ява невыпадковая, бо большасць прадпрыемстваў у цяжкім фінансавым стане. У маі колькасць стратных прадпрыемстваў, паводле даных статыстыкі, складала 2765 адзінак, альбо кожнае чацвёртае прадпрыемства. З гэтых заняпалых прадпрыемстваў нават дзяржава не можа спагнаць сваю долю ў падатках. На пачатак чэрвеня запазычанасць гаспадарчых суб'ектаў па даходах і паступленнях у бюджэт складала 3,6 трыльёна рублёў. Ды адтэрмінаваная запазычанасць дасягае 5,5 трыльёна "зайчыкаў".

Але замарожаная заработная плата і яе нізкі ўзровень, крызіс фінансаў прадпрыемстваў — толькі адзін бок, хоць і вызначальны, які характарызуе фарміраванне даходаў і жыццёвага ўзроўню народа. Другі бок — зменлівасць цэн. Зменлівасць, на жаль, не на паніжэнне, а толькі на рост, які вядзе да зглелення мільёнаў людзей. Сапраўды, толькі ў маі цэны на асобныя прадукты харчавання ў сваім росце ў 3—6 разоў перавышалі запраграміраваны двухпрацэнтны ўзровень. Так, цэны на алей выраслі на 12,4 працэнта, безалкагольныя напоі — на 10 (сяляне скардзяцца, што вада ў крамах даражэйшая за малако), цукар — на 7,3, крупы, маргарын, мясныя кансервы, каву — на 6 працэнтаў і г.д.

Асабліва рэзка падскочылі цэны ў апошні час. Заходзіш у магазін — вочы, як кажуць, вылазяць... Беларускае начальства доўга выхвалялася, што ў нас хоць і ніжэйшая, чым у Расіі, заработная плата, затое прадукты харчавання больш танныя. Але ўжо сёння цэны так падраўняліся, што гэты козыр канчаткова выбіты з рук беларускіх папулістаў. Вартасць набору з 25 асноўных прадуктаў харчавання ў цэнах апошняга тыдня мая 1998 года ў беларускіх рублях, разлічаная на аснове абменнага курсу Нацбанка Беларусі, склала ў Беларусі 1 мільён 214 тысяч рублёў, а ў Расіі — 1 мільён 251 тысячу рублёў. І гэта пры ўмове, што ў Расіі сярэдняя заработная плата складала на той час 170 долараў у месяц, а ў нас толькі 70.

Але рост цэн не абмяжоўваецца групай харчовых тавараў. Растуць цэны на паслугі. Прытым так адчувальна, што ўстрывожаныя людзі не ведаюць, як на гэта рэагаваць. Так, толькі ў маі плата за электраэнергію ўзрасла на 28,9 працэнта, за праезд у таксі — на 23 працэнты, у аўтобусах прыгарадных маршрутаў — на 15 працэнтаў, міжгародных — на 14,3 працэнта. Тарыфы на паслугі паштовай сувязі павялічыліся на 13 працэнтаў і г.д.

Што ж, братцы, атрымоўваецца? Заработная плата калі і падвышаецца, то мізэрнымі тэмпамі, а цэны скачуць з шалёнай хуткасцю. Маючы ў кішэні мільён "зайчыкаў", баішся зайсці ў магазін — такой сумы недастаткова нават для таго, каб прынесці дахаты нармальны набор прадуктаў.

А нам кажуць: расце вытворчасць, павышаецца дабрабыт людзей Такая "савецкая" прапаганда разлічана хіба толькі на сляпых людзей.

Беспредел

Всеядное Управление делами президента "наложило лапу" на грибы и ягоды белорусских лесов

В редакцию "Народной воли" попали ксерокопии двух прелюбопытнейших документов служебного пользования. Первый —"Об осуществлении контроля за деятельностью заготовителей дикорастущей продукции леса", который увидел свет в стенах Управления делами президента. Второй — письмо заместителя управделами президента В.Г.Лазовского председателю Правления "Белкоопсоюза" В.С.Владыко "О реализации дикорастущей продукции через СП "БелЭК".

Столь замысловатые официальные бумаги помогают пролить свет на волнующий сегодня многих жителей республики простой житейский вопрос: почему белорусские таможенники не позволяют вывозить за пределы Беларуси грибы и ягоды, которых очень много этим урожайным летом дарит белорусам природа.

Оказывается, дело вовсе не в том, прошли ли эти дары леса необходимый контроль, в том числе и радиационный. Все выглядит куда более прозаично. Управленческие структуры в своем привычном стиле решили "наложить лапу" даже на такой продукт, как грибы и ягоды.

В вышеупомянутых документах сообщается, что отныне лесохозяйственными предприятиями, подведомственными Управлению делами президента, принимаются "меры по расширению промысловой заготовки и увеличению экспорта дикорастущей продукции леса". "Беловежская пуща" — Государственный национальный парк республики и ряд других предприятий (каких, не оговорено, но ясное дело, что подчиненных Управлению делами президента. — **М.Э.**) учредили совместное белорусско-польское предприятие "БелЭк" и взяли на себя все хлопоты "по промысловой заготовке дикорастущей лесной продукции". И теперь только "БелЭк" может распоряжаться лесными дарами Беларуси. Куда и как использовать вырученную за грибы и ягоды валюту, государство, а точнее Титенков и его собратья будут решать самолично. Выходит, нельзя теперь белорусскому крестьянину собрать в окрестном лесу грибы и ягоды, а затем продать их "физическому лицу и субъекту хозяйствования". Ибо последние препятствуют "успешной деятельности указанного предприятия".

Аппетит у наших властей разыгрался не на шутку. Все-то они стремятся национализировать: коммерческие аптеки, частных нотариусов, студентов негосударственных вузов... А теперь задались целью "слопать" щедрый урожай лета 1998 года — пропустить ценное сырье через свои структуры, чтобы намыть с него валюту. Лопают все подряд: лисички, боровики, рыжики, подосиновики, грузди, клюкву, чернику, малину, бруснику, землянику. Переварят ли?

Мария ЭЙСМОНТ.

КІРАЎНІЦТВА СПРАВАМІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
220016, г. Мінск, вул. К. Маркса, 38

УПРАВЛЕНИЕ ДЕЛАМИ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
220016, г. Минск, ул. К. Маркса, 38

______________ № ____

Об осуществлении контроля за деятельностью заготовителей дикорастущей продукции лесов

Управление делами Президента Республики Беларусь сообщает, что подведомственными лесохозяйственными предприятиями принимаются меры по расширению промысловой заготовки и увеличению экспорта дикорастущей продукции леса. Так, Государственным национальным парком "Беловежская пуща" и рядом других предприятий учреждено совместное белорусско-польское предприятие "БелЭк", основной целью которого является работа по промысловой заготовке дикорастущей лесной продукции.

Председателю Правления "Белкоопсоюза"

Владыко В.С.

О реализации дикорастущей продукции через СП "БелЭк"

Согласно договору о совместной деятельности, заключенному в 1997 г. между совместным предприятием "БелЭк" (одним из учредителей которого является Государственный национальный парк "Беловежская пуща"), Министерством лесного хозяйства и Белкоопсоюзом просим рассмотреть вопрос о реализации дикорастущей продукции (грибов, ягод) через совместное предприятие "БелЭк".

Заместитель Управляющего делами Президента Республики Беларусь — В.Г. Лазовский

Факт

Президент решил поработать "телефонной барышней"

"Прэзідэнт Лукашэнка даў указанне старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Мікалаю Дамашкевічу вывучыць пытанне, наколькі лёгка старшыні аблвыканкамаў могуць звязацца па тэлефоне з міністрамі і віцэ-прэм'ерамі. Падставай да гэтага паслужыла інфармацыя, якая дайшла да прэзідэнта падчас яго паездкі па Гомельскай вобласці аб тым, што "міністры не толькі праз губу размаўляюць, але яшчэ і праз сакратарку". Калі гэтыя звесткі пацвердзяцца, то прэзідэнт мае намер "збіраць партфелі" міністраў і членаў урада.

БелаПАН".

Комментарий

А "праз губу" лучше всех разговаривает Иван Титенков...

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель "Народной воли".

Люди во всем мире все более успешно используют для общения последние достижения современных средств связи. Для миллионов жителей планеты радиотелефон стал привычным предметом обихода. Народы наиболее продвинутых в этом направлении стран переселяются в сети Интернета, где и ведут виртуальную жизнь в потоке информации.

А в это время в Беларуси губернаторы областей в отчаянии обрывают телефоны, тщетно пытаясь дозвониться в столицу к вышестоящему начальству. Не может провинциальное руководство связаться с членами правительства даже по правительственной связи (в просторечии АТС Кабинета министров именуется "четверкой", потому что номера там имеют четыре цифры). То ли кабели поизносились, то ли вице-премьеры лынды бьют, то ли министры в державе напрочь перевелись... Непроходимость по линии связи настолько обострилась, что на некоммуникабельность чванливой столицы областные "вертикальщики", воспользовавшись моментом, в граде Гомеле принесли челобитную самому Александру Григорьевичу Лукашенко.

Очень трудно представить себе, чтобы с подобной мелочной жалобой к главе государства обратились губернаторы, например, штатов Оклахома и Висконсин. Практически невозможно вообразить себе реакцию президента США Билла Клинтона на такую более чем странную претензию. В нормально организованных государствах высшие управленческие инстанции не вмешиваются в подробности и частности, а занимаются проблемами на своем уровне. Но это, как говорится, "их нравы".

Узнавши о горькой обиде, чинимой чиновничьему Могилеву, Гомелю, Бресту и Гродно зазнавшимся, разленившимся и зажравшимся чиновничьим же Минском, главный чиновник Лукашенко в интересах народа принял молниеносное решение поработать "телефонной барышней" — то есть самолично обеспечить прохождение государственно важных звонков, телефонограмм и факсов со второго уровня своей "вертикали" на первый.

Самоличное участие Александра Григорьевича во всяком малом деле (будь то вспашка зяби, изготовление колбасы, кладка кирпича и так далее) выражается в том, что он сначала сам подержится за штурвал комбайна, рукоятку мясорубки или кельмы, а потом отдаст привычный тройственный приказ: об усилении контроля за дальнейшим благополучным осуществлением начатого им технологического процесса; о суровом последующем наказании всех подвернувшихся под горячую руку; о тотальном информировании избирателей о новом достижении президента по наведению порядка в узко специфической конкретной сфере.

В данном конкретном случае выяснение причин возникшей телефонной непроходимости было возложено персонально на самое ответственное лицо в республике по вопросам всяческой, глубинной, всеобъемлющей внутренней разведки — на председателя Комитета государственного контроля Николая Домашкевича. Возможно, его подчиненным не составит большого труда выполнить поставленную задачу, если предположить, что телефоны важных чиновников давно подслушивают спецслужбы: можно проанализировать уже записанные разговоры высоких абонентов, а можно, азарта ради, присоединиться к известному "майору" и вести вместе с ним охоту на живца.

Возможно ли открытие сезона охоты по телефонам на вице-премьеров и министров в старой доброй Франции? Не думаю, вряд ли. Парижские высшие чиновники не так воспитаны, как белорусские. Их, в отличие от минского служилого люда, президент Жак Ширак на закрытых совещаниях кабинета не унижает, не орет на них, не вытирает о них, образно говоря, ноги. Вот мосье и не привыкли к грубому обращению. Им не приходилось терпеть публичных порок по национальному телевидению. Чувство собственного достоинства французских управленцев защищено и законами, и традициями, и моралью.

С точки зрения мелочных, шкурных, личных интересов представителей белорусского населения, имеющих ту или иную неотложную житейскую нужду до верхов, нет более благоприятного периода, чем сейчас, пока недостижимые, неуловимые, непробиваемые в обычное время министры находятся "под колпаком" у Домашкевича. Торопитесь звонить по всем известным вам номерам! Набирайте, наяривайте, трезвоньте — потому что какая же секретарша посмеет нагрубить вам сейчас, когда она под контролем? Благоприятный период долго не продлится: кончится кампания — опять останетесь с носом! Не упустите своей выгоды!

В Германии чиновников любого ранга специально обучают искусству вести разговор по телефону. О секретаршах и говорить не приходится — вышколены по высшему классу. От них даже отказ связать вас с шефом воспринимается с благодарностью. Там вообще существуют такие понятия, как культура государственного служащего и этика служебных отношений. В Бонне принятым правилам корректного официального общения с изысканной легкостью подчиняется сам канцлер ФРГ герр Гельмут Коль.

Многие нынешние руководители Беларуси вознеслись на верхи из глубинки и подняли на невиданный доселе уровень простецкую манеру разговора. Интервьюируешь, бывало, чина Администрации президента, а ощущение такое, будто на деревенской улице с мужиком калякаешь. Но бывают случаи, когда простонародная манера беседы осложняется уже благоприобретенной привычкой разговаривать через губу. По свидетельствам многих информированных людей, лучше всех это делает управляющий делами Администрации президента Иван Титенков.

Звонит Ивану Ивановичу некто. Титенков берет трубку. Абонент объясняет суть обращения. На том конце провода молчание. Человек уточняет: вы, мол, меня понимаете? В ответ из фешенебельного кабинета доносится непередаваемое по интонации просторечное: "Ну?!". Абонент торопится изложить просьбу или предложение, но и через три минуты разговора высочайшая сторона на изложенную информацию реагирует с потрясающей лаконичностью: "Дак что?" Иногда Иван Иванович снисходит к собеседнику и роняет не только междометия, но и несколько слов: "Пиши заявление"; "Бум решать"; "Проси, и тебя устроим"; "Мы держим власть!".

Стоило бы, право, в порядке теста такого рода держателям власти задать, например, вопрос:

— Как перевести на белорусский язык "Повторите, пожалуйста, последнюю фразу, я недопонял ее"?

Перевод наверняка последовал бы в истинно титенковском стиле:

— Га?

Боюсь, что только по результатам одного этого теста пришлось бы лишить портфелей добрую треть Кабинета министров.

Но, разумеется, с подачи Домашкевича президент по собственному высочайшему выбору повыгоняет с работы своих министров за ненадлежащее использование телефонов.

Можно не сомневаться, что Ивана Титенкова эта опала не коснется. Более того, многие упорно прогнозируют, что скоро из апартаментов главы Кабинета министров от Ивана Титенкова в новом качестве премьера абоненты услышат его знаменитое через губу: "Ну?!".

Читатель — газета

Что в "Банке народной мудрости"?

Прошло полтора месяца с момента опубликования в "Народной воле" моей статьи. Вопреки мнению некоторых скептиков на призыв принять непосредственное участие в разработке модели будущего нашей Родины отозвались многие читатели любимой газеты. С некоторыми из них установились личные контакты. Приятно, что этот диалог продолжается и сейчас.

Помогла творчески развить инициативу, связанную с созданием так называемого "Банка народной мудрости", читательница из Минска Г.Вышедко. Она пишет: "Уже давно можно было создать банк мудрых мыслей, просматривая письма". Спасибо, уважаемая Галина Иосифовна, за совет. Мы его обязательно учтем. Тем более что почта "Народной воли" очень богата. Кроме того, интересным и полезным видится Ваше предложение насчет проведения "круглых столов" по важнейшим проблемам нашей жизни в рабочих коллективах и студенческих аудиториях. Нельзя не согласиться и с тем, что не к лицу демократам опускаться до бульварной брани в адрес своих оппонентов, уподобляясь некоторым глашатаям режима.

Интересен вывод о том, что наши авторы по-разному видят ориентиры выхода страны из кризиса. Если определенная часть участников дискуссии видит единственным спасением Россию, то, например, В.Хатько из Минска напоминает нам, что и сама Россия исторически черпала высокую культуру у цивилизованной Европы, с времен Петра и до сегодняшних лидеров. Он так и пишет: "Беларусь должна стать настоящей европейской независимой самостоятельной страной — второй Швейцарией. Начинать строить такую Беларусь надо уже сейчас. И предложения предельно конкретные: полный нейтралитет и независимость страны; никаких военных соглашений ни с какими странами; полный вывод российских войск с территории Беларуси; сокращение армии до минимума для охраны государственных границ; существование правоохранительных органов только для защиты населения от правонарушителей, а не для борьбы с народом. Здесь же перспектива политического оздоровления: полное доверие Верховному Совету, избранному под наблюдением ОБСЕ, соблюдение демократических прав, предусмотренных Хельсинкскими соглашениями и Конституцией.

80 процентов участников заочной дискуссии главное внимание уделяют срочному и демократичному разрешению прежде всего политического кризиса, в котором оказалась Беларусь. Некоторые из них прямо пишут о том, что без конституционного отстранения от власти действующего режима невозможны никакие экономические реформы. Эти авторы выступают за немедленную реализацию их предложений. Они устали от неопределенности и бездеятельности и, выражая мнение наиболее политически активной части населения, предлагают конкретные шаги.

Примечательно, что 62 процента из числа первых читателей, откликнувшихся на мою статью, написали свои письма на белорусском языке.

Не хотелось бы скрывать от читателя тот факт, что несколько писем содержат претензии различного характера или ко всем депутатам Верховного Совета, или лично ко мне. Так, например, Н.Сидоровский из Гродно клеймит депутатов позором за признание законными результатов майского референдума 1995 года, обвиняя в том, что мы "скінулі сваю Бацькаўшчыну ў бездань дыктатуры". Г.Козлов из Жабинки назвал меня даже страусом, который 22 ноября 1997 года воздержался при голосовании за предложение В.Гончара и тем самым сделал поблажку А.Лукашенко.

Критика всегда была горькой, но в то же время и крайне полезным лекарством от политических болезней. Спасибо за неравнодушие. Уже одно это поможет выжить и не оставить борьбу.

А.Житович из Гродно прислал письмо, в котором он ставит вопрос о наивности многих политиков, в том числе и депутатов Верховного Совета, которые верят в вероятность добровольного их допуска властью к государственным СМИ и в другие методы демократизации. Сомневается Андрей Николаевич и в возможности создания объективных избирательных комиссий, высказывает мнение о предпочтительности перед всеми остальными варианта импичмента. Очень четко сформулированы предложения: "Што можна прапанаваць ва ўмовах, калі дэмакратыя безгалосая? Не штурмаваць жа нам тэлецэнтр, рэвалюцыі яшчэ нічога добрага не далі. Адзінае, што можна прапанаваць, дык гэта кансалідацыю ўсіх дэмакратычных сіл, якая неабходна дзеля правядзення любога мерапрыемства. Нам унізе гэта бачна добра і даўно, а лідэры ў Мінску ніяк да гэтага не могуць дайсці. А яшчэ кожнаму з нас на сваім месцы неабходна весці нястомную палітычна-тлумачальную работу".

С особым интересом ознакомился я и с письмом читателя из Бреста М.Пинчука. Дает он "прикурить" и известным журналистам, и редакторам, и политикам. Одно рассуждение этого автора заслуживает цитирования. М. Пинчук пишет: "В отношении ядерного оружия... Конечно же, поспешил Шушкевич с Кебичем с выводом ядерного оружия. Имея статус ядерного государства, с Беларусью не разговаривали бы через Нистюка! Но с помощью России ситуация может измениться!"

Сложные чувства вызвало письмо А.Камягина из Витебска. В целях улучшения жизни общества он предлагает стерилизовать алкоголиков и психически больных людей с выплатой им со стороны государства денежной компенсации. По его словам, "все расходы государства окупятся тем, что не надо будет оплачивать пожизненное содержание бедняг-дебилов".

Необычна почтовая карточка с таким обратным адресом — "Комаровка". Подпись — "Старый Ворчун". Очень жаль, что не придется поблагодарить за дельные и мудрые предложения конкретного человека, которому бы лично я с удовольствием пожал руку. Неизвестный автор считает, что нужна мощная партия с сильным лидером, наличие пропагандистской машины в руках оппозиции и соответствующая технология выборов.

Внимательно изучено письмо жителя Минска А.Залесского. В соответствующие комиссии Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва и структуры Национального исполнительного комитета направлены его оригинальные конкретные предложения о привязке системы оплаты труда президента и депутатов к мнению избирателей об их заслугах, доведении до широкой общественности через специальный бюллетень информации о доходах и расходах высших должностных лиц государства и депутатов парламента.

Систему референдума для экономии народных средств автор предлагает заменить системой изучения общественного мнения внесением в избирательные бюллетени на любых выборах вопросов государственного значения.

Интересным и практически вполне реализуемым видится предложение о создании в Минске на средства ООН Всемирного центра изучения последствий ядерных катастроф.

Боль и забота о судьбе Отечества — в каждой строке письма жителя Минска И.Жевняка. Он глубоко анализирует ситуацию, четко адресует свои предложения конкретным политическим силам и белорусскому народу.

Верховному Совету читатель предлагает, во-первых, завершить работу комиссии В. Гончара и передать материалы в Международный суд в Гааге, во-вторых, решить вопрос о правомочности оставшихся депутатов для принятия обязательных к исполнению документов, в-третьих, потребовать от США и Великобритании, которые стали после вывода ядерного оружия гарантами нашей безопасности и территориальной неприкосновенности, нового подтверждения своих обязательств. И.Жевняк пишет: "...мировое сообщество, с согласия Верховного Совета, должно провести на Беларуси референдум с вынесением на него вопросов, понятных на подсознательном уровне. В случае положительного ответа международное сообщество должно сформировать временное правительство представителей крупнейших демократических партий, авторитетных международных правоведов, экономистов, психологов и т.п."

Демократическим партиям Беларуси читатель предлагает учредить общественный трибунал, добиться выхода из СНГ, воздержаться от любых выборов и компромиссов с режимом. А БНФ рекомендует потребовать от России и Польши компенсаций за исторические обиды в размере около 6 триллионов долларов США.

Хотелось бы вновь вернуться к письму Г.Козлова из Жабинки. Это один из наиболее ярких и обоснованных призывов к конкретным действиям. Автор предлагает: не вступать ни в какие дискуссии с президентом и его структурами; собрать под одно крыло всех депутатов 1994 года; сделать заявление об отставке президента; взять всю законодательную власть в свои руки с опорой на местные Советы; идти в народ, на село, в городской поселок, районный центр и рассказывать людям правду. Наш собеседник пишет о том, что настоящей помощи от ОБСЕ и других международных организаций нам не дождаться, поэтому надо действовать самим. Трудно с этим не согласиться.

Я выражаю искреннюю благодарность за участие в нашей общей работе и призываю читателей продолжить ее. Предлагается такая система сотрудничества. В открывшейся рубрике "Банк народной мудрости" будут ежемесячно размещаться обзоры ваших писем. Редакция не будет их комментировать. Для пользы дела ваши письма будут направляться в соответствующие комиссии Верховного Совета и структуры Национального исполнительного комитета. При необходимости авторы предложений будут приглашаться на рабочие заседания и более подробно аргументировать свои идеи. Некоторые наиболее типичные письма газета будет публиковать полностью или частично.

Просьба в письмах указывать имя и отчество.

С уважением и признательностью —

Владимир НИСТЮК,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва.

На I Сусветных юнацкіх гульнях зборная Беларусі заняла пятае месца па колькасці заваяваных медалёў

19 ліпеня ў Маскве завяршыліся I Сусветныя юнацкія гульні. У іх прымалі ўдзел сем за паловай тысяч спартсменаў ва ўзросце ад 11 да 18 гадоў з 137 краін свету. Яны разыгралі ўзнагароды ў 15 самых папулярных відах спорту. Найбольшую колькасць медалёў заваявалі гаспадары — 123 (63 залатыя, 29 сярэбраных і 31 бронзавую). За імі размясціліся ўкраінцы — 51 (10—19—22), кітайцы — 32 (21—7—4), палякі — 25 (7—10—8) і беларусы — 24 (5—7—12). Усяго ўзнагарод былі ўдастоены спартсмены з 67 краін. Спаборніцтвы асвятлялі тры тысячы журналістаў, у тым ліку 600 замежных. Бяспеку гульняў забяспечвалі 140 тысяч супрацоўнікаў міліцыі, АМАПа, унутраных войскаў і ДАІ. У лістападзе гэтага года Міжнародны алімпійскі камітэт прыме рашэнне аб статусе Сусветных юнацкіх гульняў.

ДЗМІТРЫЙ УЛАСАЎ,
БелаПАН.

Уточнение

Адвокат — тот, кто защищает

Президиум Витебской областной коллегии адвокатов прислал в редакцию "Народной воли" претензию на мою публикацию об акте самосожжения в Новополоцке Алексея Филипченко.

Председатель президиума В.П.Абашин сообщает, что "Филипченко никогда адвокатом не был: не состоял членом областной коллегии адвокатов, никогда не был адвокатом, занимающимся индивидуальной адвокатской деятельностью и вообще даже не имел лицензии на право занятия адвокатской деятельностью".

Алексей Иванович Филипченко действительно не имел лицензии и не состоял членом областной коллегии. Однако индивидуальной адвокатской деятельностью занимался. Потому как, в соответствии с толкованием, изложенным в словаре С.Ожегова и Н.Шведова, адвокат — "юрист, которому поручается оказание юридической помощи гражданам и организациям, в том числе защита чьих-нибудь интересов в суде, защитник".

Алексей Филипченко диплом юриста имеет. Работал следователем по особо важным делам — расследовал печально известное "Витебское дело". Последние годы оказывал юридическую помощь гражданам, которые поручали ему выступать их представителем, в том числе в качестве общественного защитника в суде.

Свою последнюю "огненную" акцию он также совершил, защищая в суде интересы новополочанки Антонины Вороновой. Защищая интересы клиента, Алексей Филипченко не пожалел даже собственной жизни. Если бы такое отношение к делу было у тех адвокатов, которые в коллегии входят!

Вот почему Алексей Филипченко назван мною Адвокатом. Адвокатом с большой буквы.

Валерий ЩУКИН.

Святыні

Куточак Еўропы ў стылі класіцызму

У нашых храмаў, як і ў беларускіх людзей, аднолькавы лёс. Так склалася, што ў XX стагоддзі большасць святынь побач з мільёнамі забітых, замучаных рэпрэсіямі, скалечаных маральна і фізічна, перажыла нямала трагічных падзей. Вось і на Глыбоччыне ў гады ваяўнічага атэізму з больш чым двух дзесяткаў храмаў уцалелі лічаныя адзінкі. Астатнія па бязглуздай волі камуністычных правадыроў былі ператвораныя ў склады ўгнаенняў, школьныя класы, клубы. Іншыя прыходы былі проста зачыненыя па прычыне адсутнасці арыштаваных святароў, каштоўнейшыя помнікі мінулага пастулова разбураліся.

У гэтым сэнсе касцёлу св. Ганны ў вёсцы Мосар пашанцавала больш за іншых. Пабудаваны ў адным са старажытнейшых паселішчаў паблізу ракі Дзісна ў 1792 годзе, ён увесь час дзейнічаў, хоць таксама зведаў часы пэўнага заняпаду. Уладальнікі маёнтка, кашталяне полацкія Ганна і Роберт Бжастоўскія акрамя выдатнага палаца, пабудаванага годам раней італьянскімі дойлідамі, ахвяравалі 1000 чырвоных злотых на ўзвядзенне храма, які захаваў сваю веліч і прыгажосць да нашых дзён. Праўда, у пасляваенны час тут не было пастаяннага святара, а наездамі прыязджаў адпраўляць службу ксёндз з Глыбокага. Перад галоўным фасадам пасвіліся коні і каровы на зялёнай траве і міжволі запэцквалі дарогу да святыні. Без перабольшання, другое жыццё ў гісторыю храма ўдыхнуў прызначаны сюды ў гады перабудовы новы пробашч Ёзас Булька...

Калі ў канцы верасня 1994 года гэтыя мясціны наведаў Зянон Пазьняк з групай дэпутатаў ад апазіцыі, мінскія госці былі літаральна шакіраваны ўбачаным. На фоне ўжо ўспыхнуўшых зорак на небе асветлены пражэктарамі касцёл выглядаў як цудоўны, нейкі фантастычны па прыгажосці палац у атаясамленні акуратна пастрыжанага газона і раслíннасці, якую можна сустрэць хіба што ў Батанічным садзе сталіцы. Сведка гэтай сустрэчы расказаў мне, што вочы знешне суровага палітыка нават сталі крыху мокрыя. Потым Зянон Станіслававіч, укленчыўшы, маліўся са святаром перад алтаром. Сабраліся і прыхажане з вёскі, большасць з якіх галасавалі на прэзідэнцкіх выбарах менавіта за Пазьняка. Расчулены і ўражаны ўбачаным, лідэр апазіцыі сказаў, што так і выглядаў наш край пару стагоддзяў назад, калі на Беларусі пачалі сваё жыццё яшчэ дзесяткі такіх жа прыгожых святыняў.

Тады ж у час гутаркі ксёндз Ё.Булька падзяліўся сваімі задумамі наконт далейшага пераўтварэння гэтых мясцін. І ўжо хутка намечаныя грандыёзныя планы сталі з дапамогай парафіян рэальнасцю. Прызнацца, нямала станоўчых водгукаў я чуў аб незвычайнай прыгажосці храма ў цэнтры вёскі, пераўтворанага ў сапраўдны куток еўрапейскай культуры. Нават у шэры дажджлівы дзень, калі я наведаўся ў Мосар, убачанае не толькі моцна ўразіла, але і пакінула глыбокі след у душы.

Разбітая макрэччу гравійка ўжо ў самой вёсачцы пераходзіць у роўны асфальт і раптам, о цуд, прымушае спыніцца шырокая плошча з прыгожым паркам і асляпляльна белым храмам з цэглы на ўзгорку, абкружаным невысокай агароджай з брамай і звонніцай. Па шырокай асфальтавай дарожцы ў цэнтры, упрыгожанай скульптурай знятага з крыжа Хрыста, паволі падняўся і прайшоў у дзверы храма, які, здаецца, захаваў у сабе подых XIX стагоддзя. Скляпенне інтэр'еру галоўнай залы ўпрыгожваюць арнаментальныя размалёўкі ў стылі класіцызму, а таксама барэльефы. Не адарваць вока ад прыгажосці 10 сюжэтных рэльефаў на евангельскія тэмы, размешчаных над вокнамі ў прамавугольных рамах, дасканаласці форм старажытнага аргана пад дахам.

У храме пакуль мала людзей, а служба пачнецца дзесьці праз гадзіну. Не без унутранага хвалявання падышоў да сярэбранай труны ("рацы"), дзе пахаваны рэліквіі св.Юстына. Калі адзначаўся дзень ягонай памяці, на працягу стагоддзяў збіраліся сюды штогод некалькі тысяч беларусаў. Ехалі на конях за сотні вёрст, начавалі прама ў полі або лесе, пра што расказвалі мае бацькі. Гэта традыцыя жыве і цяпер, толькі звычайных коней замянілі легкавушкі, заказныя аўтобусы, больш за ўсё — іншамаркі. У касцёле пахаваны яго заснавальнікі, а таксама нашчадкі рода Бжастоўскіх, якія многа зрабілі для гэтых мясцін, актыўна ўдзельнічалі ў вызваленчым паўстанні 1831 года.

